

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №1 (17)
Верасень 2021

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **Вітаем маладых спецыялістаў!** | **Стар. 1** |
| **Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў** | **Стар. 2** |
| **Дзень беларускай пісьменнасці** | **Стар. 3** |
| **Прафсаюзны сход** | **Стар. 4** |
| **Дзень народнага адзінства** | **Стар. 5** |

## Вітаем маладых спецыялістаў!



**Дылеўская Паліна Дмітрыеўна,**
*настаўнік пачатковых класаў*



**Паўлій Сняжана Сяргееўна,**
*настаўнік пачатковых класаў*



**Сялецкая Людміла Міхайлаўна,**
*выхавальнік дашкольнай установы адукацыі*

Жадаем натхнення, энтузіязму, і самае галоўнае: дапытлівых і таленавітых вучняў!!! У добры шлях!!!

# Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў



1 верасня ва ўсіх установах адукацыі нашай краіны празвінеў першы званок, які стаў стартам новага навучальнага года.

У цэнтры ўвагі на лінейцы – першакласнікі: Багамаз Аляксандр, Дрыгун Мікіта, Леошка Марыя, Фурс Арсеній, Хілько Дар’я, Шаўчэнка Багдан, Шаўчэнка Дамініка; і выпускнікі: Даўгаполаў Аляксандр, Дубоўская Кацярына і Чарняўскі Мікіта.

На ўрачыстай лінейцы прысутнічаўі ганаровы госць Кунц Вадзім Уладзіміравіч – дырэктар філіяла “Фалько-Агро” ААТ “Агракамбінат “Дзяржынскі”.

Дырэктар школы Аляксандр Сяргеевіч Крыварот павіншаваў усіх з пачаткам новага навучальнага года, пажадаў навучэнцам, настаўнікам, бацькам - новых поспехаў і дасягненняў.





Аляксандр Сяргеевіч Крыварот і Вадзім Уладзіміравіч Кунц уручылі першакласнікам падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На старонках выдання “Беларусь – наша Радзіма” адлюстраваны ўсе сучасныя дасягненні беларусаў: ад эканомікі да навукі і спорту. Сотні ілюстрацый раскажуць школьнікам пра гісторыю, геаграфію і праслаўленых людзей нашай Радзімы.





# Дзень беларускага пісьменства

Дзень беларускага пісьменства праводзіцца штогод у першую нядзелю верасня.

Канцэпцыя свята прадугледжвае паказ адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа, адлюстраванне гістарычнага шляху пісьменства і друку ў Беларусі.

Традыцыйна Дзень беларускага пісьменства праходзіць у гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання.




Сёлета Дзень беларускага пісьменства праходзіў у горадзе Копыль Мінскай вобласці пад дэвізам “Слова нас аб’ядноўвае”.

4 верасня, напярэдадні святкавання Дня беларускага пісьменства, школьная бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на завочнае падарожжа "Імя, знакамітае ў вяках".

У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні 1-9 класаў. Увазе вучняў была прадстаўлена кніжная выстава, экспазіцыі якой былі прысвечаны вядомым асветнікам роднай краіны. Удзельнікам мерапрыемства быў прапанаваны цікавы інфармацыйны матэрыял пра гісторыю свята. Вучні ажыццявілі завочнае падарожжа па старонках жыцця беларускага першадрукара Францыска Скарыны, прагледзелі відэаролік "Пісьменнікі-юбіляры 2021 года"









# Прафсаюзны сход

10 верасня адбыўся прафсаюзны сход членаў прафесійнага саюза установы адукацыі. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел Апраніч Таццяна Валянцінаўна, старшыня Мінскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, Ляўко Аляксандр Мікалаевіч, старшыня райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.





Пад час адкрытага дыялогу былі абмеркаваны шматлікія пытынні, звязаныя з дзейнасцю прафсаюзнага камітэту школы, пытанні аховы працы і шмат іншага. Адбылося знаёмства с маладымі спецыялістамі ўстановы.







# Дзень народнага адзінства




17 верасня - першы ў гісторыі незалежнай Беларусі Дзень народнага адзінства. Гэты дзень стаў актам гістарычнай справядлівасці ў дачыненні да беларускага народа, падзеленага супраць яго волі ў 1921 годзе па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора, і назаўсёды замацаваўся ў нацыянальнай гістарычнай традыцыі.

Адноўленае ў 1939 годзе адзінства дазволіла Беларусі выстаяць у гады Вялікай Айчыннай вайны, заняць пачэснае месца ў міжнароднай супольнасці, стаць адным з сузаснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Напярэдадні гэтага свята ў бібліятэцы была арганізавана выстава-агляд «У адзінстве народа - сіла краіны», дзякуючы якой вучні даведаліся пра тое, што гэты дзень займае асаблівае месца сярод дзяржаўных святаў і звязаны з подзвігамі нашых продкаў згуртавацца ў імя свабоды і незалежнасці Радзімы. На выставачных паліцах былі прадстаўлены кнігі па гісторыі Беларусі, даведнікі аб грамадска-палітычным і сацыяльным развіцці краіны.

Таксама ў гэты дзень адбыліся інфармацыйныя і класныя гадзіны, прысвечаныя Дню народнага адзінства.









Рэдкалегія: вучні 5-6 класаў,
Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5-6 класаў.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 кастрычніка.